несур'ёзна пра сур'ёзнае

Дзмітрый Дземіdовіч

# Паміж намі кажучы...

*Прысвячэнні*
*Пародыі*
*Роздумы*

МІНСК
ВЫДАВЕЦТВА «ЧАТЫРЫ ЧВЭРЦІ»
2022

УДК 821.161.3-1
ББК 84(4Беи)-5
Д30

*Серыя заснавана ў 2014 годзе*

Рэдакцыйны савет:
*А. М. Зэкаў, К. В. Камейша,*
*Л. Ф. Анцух, В. А. Губараў, А. В. Кубышкіна*

**Дземідовіч, Д. А.**
Д30 Паміж намі кажучы... : прысвячэнні, пародыі, роздумы / Дзмітрый Дземідовіч. — Мінск : Чатыры чвэрці, 2022. — 98 с. — (Несур'ёзна пра сур'ёзнае).
ISBN 978-985-581-453-6.

«Паміж намі кажучы...» — кніга вершаў, у якой з лёгкім гумарам гаворыцца пра сур'ёзнае і сур'ёзна пра смешнае. Яна створана па прынцыпу: прысвячэнне пісьменніку і некалькі пародый на яго творы. Назва выдання прадвызначае, што гэта будзе круг людзей добра знаёмых аўтару і, спадзяёмся, беларускім чытачам.

**УДК 821.161.3-1**
**ББК 84(4Беи)-5**

**ISBN 978-985-581-453-6**

© Дземідовіч Д. А., 2022
© Афармленне. ТДА «Выдавецтва "Чатыры чвэрці"», 2022

*Ну што ж, сябры, у кніжцы гэтай*
*Сабраў пісьменніцкі я люд.*
*Тут і сур’ёзная дыета,*
*І жартаўлівы ёсць прысуд.*

*Ідзе народ не па ранжыру,*
*Не па заслугах стаўлю ў строй,*
*А як душы захоча ліра —*
*Яна жыве сама сабой.*

*Мы ўсе зацыклены хоць крышку,*
*Ад думак — складкі над ілбом.*
*Калі ўсур’ёз, бяры па лыжцы,*
*Калі ёсць жарт, бяры вядром.*

*Узяў сабе, другім таксама*
*Пакінь ці словам перадай,*
*Каб мозг, як цёплы дух вігвама,*
*Трымаў пазнання верх і край.*

*Не будзе строгаю размернасць*
*Ды і класічны падыход,*
*А буду сеяць вершаў зерне,*
*Як засяваў раллю народ.*



# Іна Фралова

У літгалоўспецыяліста
Задач і спраў хоць адбаўляй:
То ў Маліна ўцы насвіствай,
То тут свой голас падавай.

То ў розных школках трэба слова
Сказаць пра наш прыгожы кут,
Яшчэ выслухвай Пазнякова,
А Міхасёва слова — суд.

Яшчэ ў маскоўскім інстытуце
Ўздымае новых формаў пласт.
У нашай творчай каламуці
Іх не хапае так у нас.

Сустрэчы, творцы, вечарыны,
Сцэнарый, пошукі, прагон...
Аж разрываецца старынны
Ў яе пакоі тэлефон.

А спраў яшчэ нямала дома:
Там дзеці, кухня, страва, муж...
Калі ўжо піша, невядома...
Выдатна піша так к таму ж!

Напэўна, ёсць у Іны тайна,
Як захаваць душы спакой
І быць жаданай і прывабнай,
І быць прыветлівай такой.

# Фруктовая жанчына

*Кінула мне восень залатая*
*Даланісты ліст календара.*
*................................*
*Я ў цябе, як яблык, сакавіты.*

Іна Фралова

Кінула мне восень залатая
З дрэва пладаноснага лісток.
Я ў цябе, як яблык, сакаўная —
Ведаю, табе патрэбен сок.

Я закон прыроды не парушу,
Бо яе закон — жыцця выток.
Я ў цябе, як сакаўная груша —
Ведаю, ты вельмі любіш сок.

Каляндар адзначыць мае даты.
Ён вісіць на сценцы не дарма.
Я ў цябе лімон, хоць кіславаты,
Каб прыдаць спецыфіку і смак.

Ты з мяне мае ўсе выпіў сокі
І зрабіў выдатнейшы напой.
І скажу табе радком высокім —
Выпіта да дна цяпер табой.

Не дзяўчынай стала, сухафруктам —
Высахла і стала нежывой.
І за што такія мне пакуты
Восенню такою залатой.

# Любоўная палітра

*Я люблю цябе, рыжая восень,*
*Адшумелай лістоты апад.*

Іна Фралова

Я люблю цябе, рыжая восень,
Адшумелай лістоты апад.
Дзяўчат рыжых у нас развялося —
Я люблю вельмі рыжых дзяўчат.

І чарнявых люблю я, дарэчы,
Іх цыганскі калючы пагляд...
Іх каханне парой небяспечна —
Калі любіць, дык поўны адпад.

І бландзінкі мне душу так цешаць.
Іх любоў — флірт алькоўны і смех.
Хоць стаім мы ўсе за бязгрэшнасць,
Я вазьму на сябе гэты грэх.

Хоць пярэстыя, хоць у палоску,
Хоць у яблыках (помніце фільм?)...
Я люблю іх паважных і простых.
Эх, каб стаць зноўку мне маладым!

Паліліся, хаця іх не просіш,
Думкі, словы мае неўпапад.
Я люблю цябе, рыжая восень,
Адшумелай лістоты апад.

# Дзмітрый Пятровіч

Звініць струна. Яна маўчаць не можа.
А рукі моцна абхапілі грыф.
Гучыць раманс, нібы «Магутны Божа»,
Які ў псалом спявакператварыў.

Бярэ ён лёгка розныя сінкопы,
А мой гармонік — розныя лады.
Старэйшы я, і маю нейкі вопыт,
А ён яшчэ даволі малады.

Зусім нам гэта не перашкаджае.
Сяброўства толькі робіцца мацней.
Ён на маім шматгоддзі адгуляе,
Я да яго іду на юбілей.

І нават прозвішчы Пятровіч-Дземідовіч,
Як пераклічка роздумаў і слоў,
Што птушкай адлятаюць. Іх не зловіш,
Хіба што толькі ў летуценнях сноў.

І сны таксама россыпам мелодый
Так ненарокам прыйдуць у жыццё,
Прыгожым вершам, песенным акордам —
Загадкава-цудоўнае зліццё.

Пісаць аб ім, расказваць многа можна,
Што не сказаў, пасля дагавару.
Гучыць раманс, нібы «Магутны Божа»,
Гуляюць пальцы па нацягу струн.

# Парасон

*Завераснёвеў ранак,*
*Раскрыўшы парасон.*
Дзмітрый Пятровіч

Завераснёвеў ранак,
Раскрыўшы парасон.
Цэнтр. Камароўка. Ганак.
Прэч адыходзіць сон.

А цётка з Украіны
Ўжо на прыступках тут —
Прадаць гатова слынны
Свой сонечны прадукт.

А парасон-спадніца
Прыкрыла цэлы ар.
Бы ў схроне затаіцца
Тут мог любы тавар.

А побач шум фантана.
Струменіцца фантан.
І чэхаўская дама
Пад парасонам там.

Далей на Камароўцы
Дык парасонаў рад,
Каб не паліла сонца,
Каб дождж не біў ці град.

# Пра аўтара



Дзмітрый Аляксандравіч Дземідовіч — паэт, празаік. Піша на беларускай і рускай мовах.

Нарадзіўся 24 сакавіка 1947 г. у вёсцы Мікалаеўшчына Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці ў сям'і калгаснікаў. Скончыў з сярэбраным медалём Мікалаеўшчынскую сярэднюю школу імя Якуба Коласа (1964), энергетычны факультэт Беларускага політэхнічнага інстытута (1969). Працаваў на энергетычных аб'ектах Беларусі і былога Савецкага Саюза на розных пасадах.

Вершы і проза друкаваліся ў газетах і часопісах «Літаратура і мастацтва», «Прамень», «Вожык», «Белая вежа», у калектыўных зборніках «Неделимое русло» (поэзия), серыі ЖЗЛБ «Якуб Колас. У думках, у сэрцы, у вершах», «Па праву жывога», «Неделимое русло» (проза).

Аўтар кніг паэзіі: «Самі...» (1976), «Грани судьбы» (2005), «Прызнанне» (2007), «Двойное замыкание» (2007), а таксама паэм «Большая игра» (2007), «Афоня Убогий» (2017) і двухтомнага рамана-дылогіі «Умереть, чтобы выжить» (2012).

Уладальнік нагруднага знака «За вялікі ўклад у літаратуру».

Жыве ў г. Мінску.

# Змест

Іна Фралова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 4
Дзмітрый Пятровіч . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 7
Аляксандр Каршакевіч . . . . . . . . . . . . . . . 11
Вольга Паўлючэнка . . . . . . . . . . . . . . . . . . 15
Аліна Легастаева . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 19
Ганад Чарказян . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 24
Алена Стэльмах . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 28
Міхась Міцкевіч . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 31
Міхась Башлакоў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 36
Валянціна Паліканіна . . . . . . . . . . . . . . . . 41
Казімір Камейша . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 45
Віктар Шніп . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 49
Раіса Баравікова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 53
Анатоль Зэкаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 57
Міхась Пазнякоў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 61
Ніяна Загарэўская . . . . . . . . . . . . . . . . . . 64
Мікола Шабовіч . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 68
Мікола Маляўка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 74
Вольга Сакалова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 77

Яўген Хвалей . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 81

Мікола Мятліцкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 85

Навум Гальпяровіч . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 91

*Пра аўтара* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 95